«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

Масавыя суды над актывістамі “Маладога фронту” (абнаўляецца)

06.05.2014 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, хакей-2014



6 траўня пройдуць суды над затрыманымі напярэдадні Чэмпіянату свету па хакеі актывістамі зарэгістраванай у Чэхіі арганізацыі “Малады Фронт”. Як паведамляе сайт mfront.net у Гомелі, у судзе Чыгуначнага раёна, будзе разгледжаная адміністратыўная справа **Андруся Цянюты**, затрыманага яшчэ 4 траўня. Міліцыянты склалі на яго два адміністрацыйныя пратаколы: за дробнае хуліганства і непадпарадкаванне супрацоўнікам міліцыі.

У судзе Фрунзенскага раёна Менска адбудзецца суд над **Міколам Дземідзенкам**, якога затрымалі ўчора позна ўвечары і змясцілі ў Цэнтр ізаляцыі правапарушальнікаў. Суда таксама чакаюць **Міхась Мускі і Зміцер Крэмянецкі.** Іх справы разгледзіць суд Ленінскага раёна Менска. Ноч да суду Зміцер правёў у Ленінскім РАУСе.

Праваабаронцы расцэньваюць прэвентыўныя затрыманні актывістаў як безпадстаўныя і палітычна матываваныя.

***

Суд Ленінскага раёна Менска. **Міхася Мускага** пакаралі арыштам на 20 сутак. Суддзя - Міхаіл Хома.

Актывістаў схапілі каля новабудоўлі людзі ў цывільным, павалілі на падлогу, на голавы апранулі мяхі і ўкінулі ў аўтамабіль. У такім стане трымалі больш за гадзіну.

Зміцера Крэмянецкага абвінавачваюць у дробным хуліганстве (арт. 17.1 КаАП). Суддзя - Хома. Сведкай выступіў камандзір узводу амапу Ткачэнка. Прысуд - штраф 15 базавыз велічынь.

У судзе Фрунзенскага раёна **Міколу Дземідзенку** асудзілі па 2 артыкулах КаАП да арышту на 20 сутак. Справу Демідзенкі разглядала суддзя Людміла Лапо. Сведкі - супрацоўнікі міліцыі Крук і Зянько засведчылі, што Дземідзенка спраўляў натуральную патрэбу ў грамадзкім месцы і на заўвагі міліцыі не рэагаваў.

Андрэя Цянюту суд Чыгуначнага раёна Гомеля арыштаваў на 10 сутак: 3 сутак — за дробнае хуліганства, 7 сутак —непадпарадкаванне супрацоўнікам міліцыі. Суддзя - Анатоль Сотнікаў

Опубликовать







Паказваў "Вікторыю" на Маршы. Мужчыну асудзілі да 2,5 гадоў "хатняй хіміі" па "народным" артыкуле

Двух сябровак асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у акцыі пратэсту ў 2020 годзе

Мужа і жонку Каражан асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у акцыі пратэсту

У рэгіёнах Міншчыны праводзяць пікеты ў "падтрымку выбараў". Разбіраемся, што з імі не так

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"У традыцыях беларускага народу — дапамагаць людзям". Як праваабаронцы дапамагаюць рэпрэсаваным

Працягваецца ціск у зняволенні: агляд навінаў пра палітвязняў з 20 лютага па 12 сакавіка

"Не мной правілы прыдуманыя, не мне іх парушаць". Як існуюць няпісаныя правілы камунікацыі ў месцах зняволення

"У мяне не было магчымасці супраціўляцца інакш". Маналогі затрыманых на антыўаенных акцыях два гады таму



ГАЛОЎНАЕ

БЧБ-сцяг на акне, вымпел з "Пагоняй", выява з







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Гэта мусіла быць абмежаваннем волі, а не пазбаўленнем". Як палітвязні жывуць на "хіміі"

"У традыцыях беларускага народу — дапамагаць людзям". Як праваабаронцы дапамагаюць рэпрэсаваным

У Мінску каталіцкага верніка асудзілі да трох гадоў калоніі

Затрыманні ў Верхнядзвінску і Магілёве, новая "спецвытворчасць": хроніка пераследу 13 сакавіка

Эксперты ААН выступілі з заявай наконт палітзняволеных вясноўцаў

Сям'ю ў Гародні асудзілі за плакат, у якім нібыта змяшчалася абраза Лукашэнкі

Абнаўленні ў спісе "экстрэмісцкіх" матэрыялаў і чарговыя затрыманні: хроніка пераследу 12 сакавіка (дапоўнена)

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Люты 2024

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Выбары*2024

ВЫДАННІ





Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА


РАЦЫЯ


HUMAN
RIGHTS
HOUSE
NETWORK


kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка


fidh


ВЫТОКІ


european platform for democratic elections
epde


ADC
memorial
Anti-Discrimination Centre


МХГ
Московская Хельсинкская Группа


AMNESTY
INTERNATIONAL


МІЖНАРОДНЫ
КАМІТЭТ
ПА РАССЛЕДАВАННІ
КАТАВАННЯЎ
У БЕЛАРУСІ


Беларуская
асацыяцыя
журналістаў
baj.by


VOICE OF BELARUS


БЕЛАРУСКІ
ХЕЛЬСІНКСКІ
КАМІТЭТ


#BYSOL

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY